# ЭТНІЧНАЯ ПЕДАГОГІКА БЕЛАРУСАЎ

## Праграма спецкурса

*В. С. БОЛБАС,*
*загадчык кафедры педагогікі*
*Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута,*
*кандыдат педагагічных навук*

### ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Адной з прычын сур'ёзных няўдач педагагічных намаганняў у нашым грамадстве з'яўляецца парушэнне пераемнасці ў працэсе выхавання падрастаючых пакаленняў. Ігнараванне прынцыпу культураадпаведнасці і адрыў ад этнанацыянальных каранёў, уніфікацыя выхаваўчых падыходаў уступаюць у супярэчнасць з наяўнасцю самастойных выхаваўчых сістэм, з існаваннем істотных нацыянальных і рэгіянальных адметнасцей як вітальнага, так і ментальнага характару.

Будучыя педагогі павінны быць глыбока дасведчанымі ў пытаннях педагагічнай культуры свайго народа, умець на практыцы выкарыстоўваць народныя педагагічныя набыткі, якія выверaны жыццём і часам. Спроба ж падмяніць асэнсаванне і вызначэнне самабытнай культуры як цэласнай сістэмы акцэнтаваннем увагі толькі на асобных этнакультурных адметнасцях духоўнага жыцця беларусаў, што часта назіраецца ў арганізацыі выхаваўчага працэсу, не можа даць плёну ў выхаванні падрастаючых пакаленняў. Карэннае паляпшэнне вынікoвасці выхаваўчай работы бачыцца ў навукова абгрунтаваным выкарыстанні этнанацыянальных культурных набыткаў як пры распрацоўцы педагагічных тэорый, так і пры вырашэнні канкрэтных выхаваўчых задач.

Пабудова і станаўленне нацыянальнай школы патрабуюць адпаведнай падрыхтоўкі педагагічных кадраў, адным з важнейшых кампанентаў якой павінна быць грунтоўнае вывучэнне назапашанага народам педагагічнага вопыту, без выкарыстання якога ўвогуле немагчыма стварэнне нацыянальнай сістэмы аду-

кацыі. Аказаць адпаведную дапамогу ў гэтым і заклікаины спецкурс «Этнічная педагогіка беларусаў».

Вельмі важна, каб пры арганізацыі работы са студэнтамі па вывучэнню этнапедагагічнай спадчыны нашага народа была ўстаноўлена адпаведная сувязь з іншымі дасцыплінамі псіхолага-педагагічнага цыкла. Студэнты павінны выразна ўсведамляць, што навуковая педагогіка і этнапедагогіка знаходзяцца ў дыялектычным адзінстве і не супярэчаць адна адной.

Спецыфіка названага курса заключаецца ў тым, што ў нас пакуль што няма абагульняючых прац, якія цэласна, адносна поўна і на дастатковым навуковым узроўні асвятлялі б яго змест. Адначасова з гэтым назапашаны значны матэрыял у этнаграфічных, гісторыка-педагагічных і іншых працах, які можа даць даволі выразнае ўяўленне аб этнапедагогіцы беларусаў. Задача выкладчыкаў педагагічных навучальных устаноў заключаецца ў тым, каб арганізаваць самастойную навучальную работу студэнтаў з аказаннем ім адпаведнай метадычнай дапамогі.

Увесь курс разлічаны на 24 гадзіны, з іх 8—семінарскія заняткі. Пасля кожнай тэмы даецца спіс рэкамендуемай літаратуры.

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назва тэмы | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі |
| 1 | Этнічная педагогіка ў сістэме педагагічнай культуры | 2 | |
| 2 | Гісторыя вывучэння этнапедагогікі беларусаў | 2 | |
| 3 | Мэты выхавання ў народнай педагогіцы беларусаў | 2 | |
| 4 | Асноўныя выхаваўчыя ідэі этнапедагогікі беларусаў | 2 | 4 |
| 5 | Народная педагогіка аб сямейным выхаванні | 2 | |
| 6 | Патрабаванні народнай педагогікі да практычнай арганізацыі выхавання дзяцей | 2 | |
| 7 | Метады і сродкі народнай педагогікі беларусаў | 2 | 2 |
| 8 | Асноўныя накірункі выкарыстання этнапедагагічных ідэй у сучасных умовах | 2 | 2 |

## ЗМЕСТ КУРСА

### Тэма 1. ЭТНІЧНАЯ ПЕДАГОГІКА Ў СІСТЭМЕ ПЕДАГАГІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ.

Паняцці «этнас», «нацыя», «народ». Сусветная культура і культура этнасу. Арганічная цэласнасць рэгіянальна-этнічнай



культуры. Разнастайнасць народнай культуры. Асаблівасці гістарычнай дынамікі развіцця духоўнай культуры.

Этнапедагогіка як неад'емная частка народнай культуры і сукупнасць ідэй аб рэгіянальна-этнічнай культуры выхавання. Дэтэрмінаванасць этнічнай педагогікі нацыянальнай культурай. Традыцыйна-бытавая культура і традыцыйна-бытавая педагагічная культура. Этнічная педагогіка і народная педагогіка, іх агульнасць і адрозненні. Сацыялагічны і энтаграфічны падыходы пры вызначэнні паняццяў «народная педагогіка» і «этнічная педагогіка». Паняційна-тэрміналагічны апарат этнапедагогікі.

Этналогія і этнапедагогіка. Дзве функцыі этналогіі (з'яўляецца метадалагічнай асновай і эмпірычным базісам этнапедагогікі). Этнапедагогіка і навуковая педагогіка, іх узаемасувязь і дыялектычнае адзінства. Народная педагогіка — важнейшая крыніца навуковай педагогікі. Засваенне народнай педагогікай прафесіянальных педагагічных новаўвядзенняў, якія даступны і практычна мэтазгодны для ўсяго насельніцтва.

Этнічная педагогіка як вынік народнай творчасці. Выхаваўчы патэнцыял асобных відаў народнай творчасці. Этнапедагогіка і паэтычная народная творчасць. Вырашэнне педагагічных задач асобнымі відамі народнай творчасці. Дзіцячы фальклор, яго поліфункцыянальнасць і псіхолага-педагагічная скіраванасць. Асноўныя формы захавання энтапедагагічных ведаў. Педагагічная творчасць народа. Эмпірычны характар народных уяўленняў аб выхаванні. Сінкрэтызм народна-педагагічных ведаў.

Ідэі нацыянальных мысліцеляў і педагогаў і этнічная педагогіка. Спалучэнне калектыўнага розуму і шматвяковага народна-выхаваўчага вопыту пры фарміраванні этнапедагагічнай культуры. Пераемнасць як важнейшы фактар жыццядзейнасці народнай педагогікі.

### Літаратура

**Белогуров Л., Белогуров Ю., Елкашова Г.** Гуманизация и этнизация: две реалии современной педагогики // Педагогика. 1996. № 3.

**Волков Г. Н.** Этнопедагогика. Чебоксары, 1974.

**Грымаць А., Сизы А.** ...А жыць будзем сваім розумам: народная педагогіка // Настаўніцкая газета. 1993. 17 красавіка.

**Грымаць А. А.** Нацыянальная педагогіка // Народная асвета. 1995. № 1.

**Казакова І. В.** Народная творчасць у фарміраванні этнасу беларусаў // Весці АН Беларусі. 1995. № 1.

**Комарова Г. А.** О понятии «этнопедагогика» в советской этнографической и педагогической науке // Изучение преемственности этнокультурных явлений. М., 1980.

**Новицкая М.** Ступени преемственности: народный педагогический опыт // Обруч. 1997. № 1.

**Орлова А. П.** Народная педагогика и подготовка учителя (на опыте белорусской школы 1917—1931 гг.) // Советская педагогика. 1981. № 11.

**Салееў В. А.** Этнапедагогіка ці народная педагогіка // Адукацыя і выхаванне. 1996. № 5.

**Сычева Л.** Перед пришествием. Размышления о народной педагогике // Учительская газета. 1996. № 35.

**Христова Е. Л.** Об уточнении понятийного аппарата этнопедагогики // Советская педагогика. 1989. № 7.

## **Тема 2.** ГІСТОРЫЯ ВЫВУЧЭННЯ ЭТНАПЕДАГОГІКІ БЕЛАРУСАЎ.

Залежнасць ацэнкі культурна-педагагічных дасягненняў народа ад узроўню пазнання яго культуры.

Мысліцель і асветнік XVII ст. Саламон Фёдаравіч Рысінскі — першапраходца ў вывучэнні айчыннай народна-педагагічнай думкі. Беларускі этнаграфічны матэрыял як важная састаўная частка парэміялагічнай працы С. Ф. Рысінскага. Этнапедагагічны патэнцыял зборніка «Прыказкі і прымаўкі». Параўнальны аналіз выдання С. Ф. Рысінскага і аналагічнай працы Яна Амоса Каменскага. Захаванасць пастулатаў народнай педагогікі сярэднявечча да нашых дзён.

Пачатак сістэматычнага даследавання беларускай народнай педагогікі ў XIX ст. Навукова-даследчы і літаратурна-мастацкі аспекты дзейнасці Яна Чачота. Фальклорна-аўтэнтычная адметнасць твораў народазнаўцы. Этнакультурныя набыткі беларусаў як адна з важнейшых крыніц творчасці Адама Міцкевіча. Таварыства філаматаў аб ролі народнай культуры ва ўдасканаленні грамадства. Асаблівасці падыходаў віленскага аб'яднання філарэтаў у вызначэнні зместу і шляхоў удасканалення грамадства.

Дзейнасць этнографаў-педагогаў другой паловы XIX ст. па вывучэнню этнапедагагічнай спадчыны беларускага народа. Рух за культурнае адраджэнне краіны. А. Я. Багдановіч як адзін з пачынальнікаў навуковага асэнсавання асноў народнай педагогікі беларусаў. Этнапедагагічнае значэнне прац І. Д. Гарбачэўскага, П. П. Дземідовіча, М. А. Дзмітрыева, Ю. Ф. Крачкоўскага, І. І. Насовіча, М. Я. Нікіфароўскага, П. В. Шэйна, М. А. Янчука.

Уклад фалькларыстаў канца XIX—пачатку XX ст. у вывучэнне асноў народнай педагогікі. Даследчая дзейнасць М. В. Доўнар-Запольскага, Я. Ф. Карскага, Е. Р. Раманава, І. А. Сербава, А. К. Сержпутоўскага па вывучэнню культуры і быту беларусаў.

Пачатак навукова-педагагічнага абагульнення этнапедагагічных ідэй народаў былога СССР (Г. С. Вінаградаў, Г. Н. Волкаў). Вывучэнне этнапедагагічных ідэй беларусаў у савецкі перыяд. Працы М. Я. Грынблата, У. М. Дабравольскага, А. А. Мялешкі, У. І. Пічэты, М. М. Нікольскага. Дзейнасць Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі Беларусі.

Сучасны стан этнапедагагічных даследаванняў. Значэнне этнаграфічных даследаванняў В. К. Бандарчыка, Г. А. Барташэвіч, М. Ф. Піліпенкі, А. С. Фядосіка ў вывучэнні этнапедагогікі беларусаў. Вылучэнне ў самастойны навукова-даследчы накірунак вывучэння народнай педагогікі беларусаў. Дзейнасць лабараторыі гісторыі педагогікі і этнапедагогікі Нацыянальнага інстытута адукацыі.

### Літаратура

**Асвета і педагагічная думка ў Беларусі.** Са старажытных часоў да 1917 г. / М. А. Ткачоў, У. С. Пасэ, Г. Р. Сянькевіч і інш. Мн., 1985.

**Бандарчык В. К.** Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст. Мн., 1964.

**Бандарчык В. К.** Гісторыя беларускай этнаграфіі. Пачатак XX ст. Мн., 1970.

**Бандарчык В. К.** Гісторыя беларускай савецкай этнаграфіі. Мн., 1972.

**Болбас В. С.** Цнот і навукі прыхільнік: Да 200-годдзя з дня нараджэння Яна Чачота // Адукацыя і выхаванне. 1996. № 7.

**Гістарыяграфія этнаграфіі** // Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989.

**Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі** / Пад рэд. С. А. Умрэйкі, Г. Р. Сянькевіч, У. К. Андрэенкі, П. С. Сонцава. Мн., 1968.

**Порецкий Я. И.** Соломон Рысинский. Solomo Pantherus Leukorussus. Конец XVI — начало XVII в. Мн., 1983.

**Цішчанка І. К.** Ля народных вытокаў. Збіранне і вывучэнне беларускага фальклору ў 50—60-я гады XIX ст. Мн., 1986.

## **Тэма 3.** МЭТА ВЫХАВАННЯ Ў НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ БЕЛАРУСАЎ.

Народная мудрасць аб ролі выхавання ў жыцці грамадства. Фактар спадчыннасці ў развіцці чалавека. Цесная сувязь спадчыннасці з выхаваўчым мікраасяроддзем. Магчымасці ўдасканалення чалавечай асобы. Далучэнне выхаванцаў да глыбінных асноў нацыянальнай культуры — важная задача народнай педагогікі. Іерархія каштоўнасцей грамадства ў народна-выхаваўчай сістэме. Абгрунтаванне неабходнасці шматбаковасці развіцця асобы. Маральна-духоўная скіраванасць этнапедагогікі беларусаў. Народныя ўяўленні аб крытэрыях выхаванасці асобы.

Вызначэнне мэт выхавання асобы — цэнтральнае звяно любой выхаваўчай сістэмы. Залежнасць народна-выхаваўчых мэт ад знешніх і ўнутраных фактараў развіцця грамадства. Найважнейшыя прыродна-геаграфічныя, сацыяльна-гістарычныя, грамадска-палітычныя і эканамічныя ўмовы фарміравання беларускай

народнасці. Уплыў язычніцтва і хрысціянства на вызначэнне мэт народнага выхавання. Элементы балцкай ментальнасці ў выхаваўчых мэтах беларусаў. Руская і польская, праваслаўная і каталіцкая традыцыі ў вызначэнні мэт народнай выхаваўчай сістэмы.

Паступовая падрыхтоўка дзяцей да самастойнага жыцця — важнейшая мэта народнага выхавання. Выхаванне сем'яніна, працалюбівага і руплівага гаспадара. Істотныя адрозненні ў вызначэнні мэт пры выхаванні хлопчыкаў і дзяўчынак. Адметныя рысы характару беларусаў, фарміраванне якіх знаходзіць увасабленне ў народна-выхаваўчых мэтах. Этнанацыянальныя асаблівасці разумення дасканалага чалавека.

Выхаваўчы ідэал беларускай народнай педагогікі. Яго трансфармацыя на працягу развіцця грамадства. Агульначалавечае і адметнае этнанацыянальнае ў выхаваўчых мэтах айчыннай педагагічнай думкі. Забеспячэнне пераемнасці народных культурна-педагагічных здабыткаў, клопат аб узнаўленні этнасу — характэрная асаблівасць этнічнай педагогікі беларусаў.

## Літаратура

**Болбас В. С.** Ідэі маральнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі эпохі Адраджэння (XVI—XVII стст.). Мн., 1996.

**Кацько У.** Крупінкі народнай мудрасці. (Беларускі фальклор) // Народная асвета. 1980. № 6.

**Казлоў У. В.** Асабістае і грамадскае ў ідэалах казачнага героя // Беларуская літаратура. Вып. 11. Мн., 1983.

**Казлоў У. В.** Эстэтычнае ўвасабленне народных ідэалаў у беларускай казцы // Беларуская літаратура. Вып. 6. Мн., 1978.

**Козлов В. В.** Народные идеалы и действительность в белорусской сказке. Гомель, 1985.

**Народная мораль** // Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989.

**Рудкоўская Р. Е.** Маральны ідэал у беларускай народнай педагогіцы // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта. 1997. № 2.

**Фядосік А. С.** Фальклор у фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў // Адукацыя і выхаванне. 1994. № 10.

**Фядосік А. С.** Фальклор і менталітэт народа // Полымя. 1996. № 11.

**(Заканчэнне будзе)**

# ЭТНІЧНАЯ ПЕДАГОГІКА БЕЛАРУСАЎ

## Праграма спецкурса

***В. С. БОЛБАС,***
***загадчык кафедры педагогікі***
***Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута,***
***кандыдат педагагічных навук***

**(Заканчэнне. Пачатак у № 8)**

**Тэма 4.** АСНОЎНЫЯ ВЫХАВАЎЧЫЯ ІДЭІ ЭТНАПЕДАГОГІКІ БЕЛАРУСАЎ.

Працоўнае выхаванне як першааснова народна-выхаваўчай сістэмы. Выхаванне працай і ў працы. Праца — аснова выхавання станоўчых чалавечых якасцей. Актыўная дзіцячая дапамога дарослым у вядзенні хатняй гаспадаркі. Паступовае ўскладненне дзейнасці дзяцей пры абслугоўванні саміх сябе. Свядомае далучэнне дзяцей да вытворчай працы дарослых. Народная перыядызацыя дзіцячага ўзросту пры далучэнні дзяцей да працы.

Віды працы і іх выхаваўчае ўздзеянне на дзяцей. Культ зямлі і культ хлеба як неабходныя спадарожнікі працоўнага выхавання ў Беларусі. Разбуральны ўплыў гультайства на духоўны свет індывіда. Адносіны народа да спажыўцоў чужых вынікаў працы.

Народна-педагагічная мудрасць аб разумовым выхаванні. Разумовае выхаванне як неабходная ўмова фарміравання дасканалага чалавека. Народныя ўяўленні аб адукацыі як важнейшым сродку пашырэння магчымасцей чалавека, фарміравання яго індывідуальнасці. Галоўныя фактары разумовага развіцця. Народная педагогіка аб ролі адукацыі ў выхаванні дзяцей і неабходнасці ўласных намаганняў у авалоданні ведамі.

Этыка-маральны аспект этнапедагогікі беларусаў. Народная мараль як неафіцыйны рэгулятар паводзін людзей ва ўсіх сферах грамадскага і асабістага жыцця. Увасабленне асноўных пастулатаў народнай маралі ў сямейна-бытавой маралі. Маральна-духоўны патэнцыял дасканалага чалавека. «Залатое» правіла маральнасці ў беларускай народнай педагогіцы. Этычная культура народа як ядро яго выхаваўчай сістэмы. Асаблівасці маральнага ідэалу беларускай народнай педагогікі. Народныя крытэрыі маральнасці чалавека. Фарміраваннне адносін да людзей, да сябе, да жывой і нежывой прыроды. Дабрата, праўдзівасць, справядлівасць, сумленне, сорам — асноўныя маральныя катэгорыі народнай педагогікі. Выхаванне міласэрнасці. Шматварыянтнасць падыходаў у раскрыцці зместу маральнасці. Маральна-рэлігійнае выхаванне. Сінтэз народнай маралі і хрысціянскай этыкі. Абшчынная, таварыская скіраванасць народнай маралі, яе карані і крыніцы. Арыентацыя на агульнае дабро. Народная педагогіка аб людскіх заганах.

Этнічная педагогіка беларусаў аб эстэтычным развіцці асобы. Уменне ўспрымаць прыгожае — важная задача этнічнай педагогікі. Эстэтычнае светаадчуванне беларусаў. Этнаэстэтыка як з'ява культуры. Дзейсны характар этнаэстэтыкі. Вырашэнне агульнавыхаваўчых задач праз павышэнне эстэтычнага ўзроўню асобы і грамадства. Выхаванне патрэбнасці да стварэння прыгожага, пераўтварэння жыцця па законах прыгажосці. Народная непрымірымасць да пачварнага і агіднага. Задача выхавання пачуццяў. Спецыфіка праяўлення нацыянальных пачуццяў. Выхаванне творчасцю. Эстэтыка народных свят і абрадаў.

Нацыянальная самасвядомасць і этнічнае выхаванне. Нацыянальныя аспекты грамадскага жыцця. Характэрныя прыкметы, якія вызначаюць этнічную самаідэнтыфікацыю беларусаў. Адносіны да гістарычнай памяці народа. Адносіны народа да роднага слова. Асаблівасці патрыятычных пачуццяў беларусаў.

Фізічнае выхаванне ў этнапедагагічных ідэях беларускага народа. Народныя ўяўленні аб здароўі як важнейшым багацці ў жыцці. Клопат аб здаровым патомстве. Загартоўка дзяцей. Фізічнае развіццё як перадумова фарміравання асобы. Сіла волатаў — аснова велічных спраў.

Этнапедагогіка беларускага народа аб экалагічным выхаванні падрастаючых пакаленняў. Шматвяковыя экалагічныя традыцыі беларусаў.

Народнае ўспрыманне прыроды як агульначалавечай каштоўнасці, якая задавальняе многія матэрыяльныя і духоўныя патрэбнасці чалавека. Выпрацоўка практычных навыкаў зносін з навакольным асяроддзем. Прывіццё пачуцця адказнасці за будучыню прыроды. Выхаванне нецярпімасці да дзеянняў, якія наносяць шкоду прыродзе. Развіццё ў індывіда пачуцця абаронцы жывёл і раслін. Фарміраванне эмацыянальна-эстэтычнай сферы ў працэсе зносін з прыродай.

Этнапедагогіка беларусаў аб інтэграваным характары чалавечых рыс і якасцей. Цесная ўзаемасувязь, арганічная непадзельнасць розных накірункаў выхавання ў народнай педагогіцы. Іх злітнасць з жыццём і навакольным асяроддзем. Прагматычна-утылітарны характар народнага выхавання.

## Літаратура

**Асноўныя выхаваўчыя ідэі беларускай народнай педагогікі** і іх ацэнка з пазіцыі сучаснасці // Кавалевіч М. С. Педагогіка. Ч. 1. Брэст, 1995.

**Арлова А. М.** Прыказкі і прымаўкі — адна з крыніц маральнага выхавання // Народная асвета. 1988. № 2.

**Болбас В. С.** Жыватворная крыніца. Маральна-выхаваўчыя ідэі народнай педагогікі Беларусі // Пачатковая школа. 1994. № 7, 8.

**Коваленко Н.** Народная педагогика — кодекс нравственного воспитания молодежи // Школа. 1997. №3.

**Майсейчык А. А.** Гераічныя матывы ў беларускім фальклоры // Беларуская мова і літаратура. 1995. Вып. 1.

**Ракава Л. В.** Народная педагагічная сістэма // Адукацыя і выхаванне. 1996. № 2.

**Салееў В. А.** Этнапедагогіка і эстэтычнае развіццё асобы. Мн., 1994.

**Салееў В. А.** Этнаэстэтыка як феномен // Адукацыя і выхаванне. 1994. № 5.

**Сярмяжка Я. І.** Бязмежна ты, мудрасць народа // Адукацыя і выхаванне. 1993. № 12.

**Турбіна Л. М.** Экалагічная свядомасць народа, адлюстраваная ў беларускіх легендах і паданнях // Весці АН Беларусі. 1994. № 1.

## Тэма 5. НАРОДНАЯ ПЕДАГОГІКА АБ СЯМЕЙНЫМ ВЫХАВАННІ.

Спецыфіка сямейнага выхавання. Сям'я — першая і важнейшая сфера фізічнага, маральнага, эмацыянальнага і інтэлектуальнага развіцця дзіцяці. Сям'я як галоўнае звяно сувязі паміж пакаленнямі. Адметнасці сямейнага побыту беларусаў. Важнейшыя функцыі сям'і. Скіраванасць выхавання на падрыхтоўку да будучага сямейнага жыцця. Адбітак адметнасцей нацыянальнага характару беларусаў на сямейным выхаванні. Выхаванне ў сялянскіх сем'ях. Іерархія ў адносінах паміж дарослымі і дзецьмі. Звычай дзядзькавання. Адрозненні ў выхаванні хлопчыкаў і дзяўчынак. Асаблівасці ўзроставай перыядызацыі ў беларускай сям'і. Правы і абавязкі дзяцей кожнай узроставай ступені. Сямейна-шлюбныя абрады як сродак выхавання дзяцей. Сям'я як фактар сацыялізацыі і этнізацыі асобы. Традыцыі і звычаі ў сямейным выхаванні.

Роля бацькоў у выхаванні дзяцей. Бацька і маці — першыя выхавальнікі. Любоў дзяцей да маці як першааснова фарміравання маральнасці асобы. Асаблівасці ўнутрысямейных зносін. Народная мудрасць аб значэнні сямейнага ладу. Трывалая і моцная сям'я — неабходная ўмова поспехаў у выхаванні дзяцей. Удзел дзядуль і бабуль у выхаванні ўнукаў. Становішча жанчыны ў беларускай сям'і. Удзел кроўных сваякоў у сямейным выхаванні. Пашырэнне непасрэдна выхаваўчага ўздзеяння на дзяцей шляхам далучэння да кроўных родзічаў названых сваякоў (бабка-пупарэзніца, кум, кума і інш.). Традыцыі абшчыннасці,



супольнасці ў беларускай народнай педагогіцы, іх уплыў на сямейнае выхаванне. Узаемасувязі грамадскага і сямейнага выхавання як вырашальны фактар іх эфектыўнасці. Дзіцячае выхаваўчае асяроддзе. Узаемаадносіны старэйшых і малодшых дзяцей у сям'і і іх значэнне ў выхаванні і самавыхаванні падлеткаў. Дзіцячая талака як важны выхаваўчы фактар фарміравання асобы. Дзіцячы фальклор у сямейным выхаванні.

## Літаратура

**Болбас В. С.** Сям'я і выхаванне дзяцей у феадальнай Беларусі // Пачатковая школа. 1994. № 4.

**Калачова І. І.** Сямейнае выхаванне на Беларусі (другая палова XIX — пачатак XX ст.) // Адукацыя і выхаванне. 1994. № 10.

**Калачова І. І.** Роля сям'і ў трансмісіі этнапедагагічных традыцый беларусаў // Адукацыя і выхаванне. 1995. № 4.

**Общественный, семейный быт** и духовная культура населения Полесья. Мн., 1987.

**Сямейна-бытавыя песні.** Мн., 1984.

**Сямёнава В. В.** Выхаванне ў беларускай сям'і // Праблемы выхавання. 1996. Вып. 4.

**Сям'я і сямейны быт беларусаў.** Мн., 1990.

**Чэчат В. У.** Педагогіка сямейнага выхавання. Мн., 1995.

## Тэма 6. ПАТРАБАВАННІ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІКІ ДА ПРАКТЫЧНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ.

Шматвяковы выхаваўчы народны вопыт — аснова выяўлення пэўных заканамернасцей, якія імпліцыйна ствараюць педагагічны падмурак самастойных этнанацыянальных выхаваўчых сістэм. Формы выражэння народных патрабаванняў да выхавання дзяцей. Гібкасць, шматварыянтнасць народна-педагагічных прынцыпаў арганізацыі выхаваўчага працэсу. Грамадскі характар народнага выхавання.

Народныя ўяўленні аб сувязі навучання і выхавання. Выхаваўчы патэнцыял адукацыі. Народная педагогіка аб неабходнасці ўласных намаганняў у авалоданні ведамі. Роля разумовых пачаткаў у арганізацыі выхавання. Неабходнасць уздзеяння на свядомасць выхаванцаў. Даходлівасць і зразумеласць для дзяцей выхаваўчых намаганняў дарослых. Этнапедагогіка беларусаў аб характары адносін выхавальнікаў да выхаванцаў і аб бацькоўскай любві да дзяцей. Гуманнасць і патрабавальнасць у адносінах да дзяцей.

Народныя ўяўленні аб ролі пачуццяў у выніковасці выхавання. Патрабаванні да сістэматычнасці, паслядоўнасці і паступовасці выхаваўчага ўздзеяння. Неадрыўнасць выхавання ад жыцця. Актыўнасць асобы ў працэсе самаўдасканалення.

Прыродазгоднасць выхавання ў асноўных народна-выхаваўчых пастулатах. Шматаспектнасць тлумачэння прыродазгоднасці ў выхаванні. Перыядызацыя дзіцячага ўзросту пры арганізацыі выхавання. Індывідуальны падыход. Цесная сувязь з прыродай як характэрная ўмова народнага выхавання. Своеасаблівасці падыходаў пры выхаванні хлопчыкаў і дзяўчынак. Зварот да падсвядомасці выхаванцаў як незаменнага фактару фарміравання звычак — характэрная асаблівасць прыродазгоднай народнай педагогікі.

### Літаратура

**Болбас В. С.** Жыватворная крыніца. Маральна-выхаваўчыя ідэі народнай педагогікі Беларусі // Пачатковая школа. 1994. № 7, 8.

**Зубко Дз. А.** На народных традыцыях // Народная асвета. 1993. № 3.

**Кавалевіч М. С.** Ты вечная, мудрасць народная // Народная асвета. 1994. № 7.

**Конон В.** Утро совести, или Категорический императив фольклора // Детская литература. 1989. № 9.

**Народная мараль** // Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1989.

**Психологические особенности** использования народных традиций в воспитании ребенка / АМН СССР, НИИ общ. и пед. психологии: М. Г. Тайчинов и др. М., 1991.

**Ракава Л. В.** Народная педагагічная сістэма // Адукацыя і выхаванне. 1996. № 2.

**Сярмяжка Я. І.** Бязмежна ты, мудрасць народа // Адукацыя і выхаванне. 1993. № 12.

**Шуляк Э. А.** На народных традыцыях // Народная асвета. 1995. № 1.

## Тэма 7. МЕТАДЫ І СРОДКІ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІКІ БЕЛАРУСАЎ.

Перакананне як галоўны шлях выхавання ў этнічнай педагогіцы беларусаў. Народна-выхаваўчыя метады і сродкі яго ажыццяўлення. Родная мова як асноўны народна-выхаваўчы сродак. Павучанні, растлумачэнні, наказы, парады. Шматлікія віды народнай творчасці як дзейсны сродак этнічнай педагогікі. Асаблівасці выхаваўчага ўздзеяння фальклору. Выхаваўчая роля прыказак і прымавак. Дзеці і казкі. Дыдактычнасць, павучальнасць, апеляцыя да розуму і пачуццяў, пошукі шляхоў удасканалення чалавека і грамадства ў беларускіх народных казках. Выхаваўчы патэнцыял народных песень. Адрасаванасць песеннага жанру да розных перыядаў і праяў жыцця: ад калыханкі да пахавальных галашэнняў. Развіццёва-пазнавальная функцыя народных загадак.

Метад прыкладу — адзін з важнейшых метадаў этнапедагогікі. Шматварыянтнасць яго выкарыстання і натуральнасць



ажыццяўлення. Блізкасць, даступнасць і зразумеласць для выхаванцаў народна-выхаваўчых узораў для пераймання.

Заахвочванні і пакаранні ў айчыннай народна-выхаваўчай сістэме. Прынцыпы іх выкарыстання. Адносіны народнай педагогікі да розных відаў фізічных пакаранняў. Месца забарон і перасцярог у народным выхаванні. Умовы эфектыўнасці выкарыстання асуджэнняў і пагроз. Народны сарказм у адносінах да людскіх недахопаў. Смехавая культура беларускага народа як самастойна значны выхаваўчы накірунак.

Выкарыстанне прывучэнняў у якасці дзейсных спосабаў выхавання дзяцей. Звычаёва-побытавы ўклад беларусаў як аснова практычнай арганізацыі выхавання. Фарміраванне звычак у паводзінах дзяцей — адна з важнейшых умоў эфектыўнасці народнага выхавання. Свядома-асэнсаваны і імператыўна-катэгарычны падыход да прывучэнняў.

Педагогіка працы — аснова выхаваўчай сістэмы беларускага народа. Полаўзроставыя асаблівасці яе выкарыстання. Натуральнае імкненне дзяцей да дзейнасці як аснова выкарыстання працы ў якасці эфектыўнага выхаваўчага сродку. Арганічнае перапляценне асноўных выхаваўчых накірункаў, метадаў і сродкаў выхавання ў далучэнні дзяцей да працы. Дзіцячыя гульні як важнейшы народна-выхаваўчы сродак. Маштабнасць і універсальнасць народна-гульнявай культуры як выдатнага культурна-гістарычнага феномена і яе роля ў развіцці этнасу. Характарыстыка беларускіх народных гульняў. Трансфармацыя праз народныя гульні вопыту сацыяльных паводзін, вырашэнне задач фізічнага, разумовага і маральнага выхавання.

Выключна важная роля традыцый, звычаяў, абрадаў у выхаванні падрастаючых пакаленняў. Арганічнае спалучэнне ў народна-выхаваўчым працэсе шматлікіх метадаў і сродкаў выхавання.

### Літаратура

**Беларуская фалькларыстыка.** Мн., 1989.

**Валодзіна Т. В.** Талака. Тэкст і кантэкст // Весці АН Беларусі. 1995. № 1.

**Вількін Я. Р.** Беларускія народныя гульні. Мн., 1969.

**Дзіцячы фальклор** / Пад рэд. К. П. Кабашнікава. Мн., 1972.

**Загадкі** / Пад рэд. А. С. Фядосіка. Мн., 1972.

**Кабашнікаў К. П.** Беларускі фальклор у параўнальным асвятленні. Гістарыяграфічны нарыс. Мн., 1981.

**Кавалевіч М. С.** Ты вечная, мудрасць народная // Народная асвета. 1994. № 7.

**Кучарава А. В., Гатальская Г. В.** Псіхатэрапеўтычныя метафары ў беларускім фальклоры. Выхаваўчая роля ў развіцці асобы // Адукацыя і выхаванне. 1997. № 11.

**Народная педагогіка, яе сродкі і метады** // Кавалевіч М. С. Педагогіка. Ч. 1. Брэст, 1995.

**Чэчат В. У.** Педагогіка сямейнага выхавання. Мн., 1995.

**Шуляк Э. А.** На народных традыцыях // Народная асвета. 1995. № 1.

**Этнография восточных славян.** Очерки традиционной культуры. М., 1987.

## Тэма 8. АСНОЎНЫЯ НАКІРУНКІ ВЫКАРЫСТАННЯ ЭТНАПЕДАГАГІЧНЫХ ІДЭЙ У СУЧАСНЫХ УМОВАХ.

Фрагментарнасць і хаатычнасць у выкарыстанні набыткаў народнай культуры — галоўны недахоп сучаснага выхавання. Асноўныя заканамернасці трансляцыі традыцыйнага народнага вопыту ў сучасных умовах. Неабходнасць распрацоўкі агульна-тэарэтычных праблем этнапедагогікі і ўзбагачэння педагагічнай навукі і практыкі дасягненнямі народна-выхаваўчага вопыту.

Этнапедагагічная думка беларускага народа як важнейшая крыніца распрацоўкі новых выхаваўчых падыходаў нацыянальнай школы. Этнізацыя моладзі. Насычэнне навучальна-выхаваўчага працэсу ў школе этнаграфічным матэрыялам. Увядзенне этнакультурных элементаў у змест адукацыі. Далучэнне выхаванцаў да збору і вывучэння беларускай вуснай народнай творчасці.

Залежнасць выхавання ад рэгіянальна-нацыянальных фактараў (свядомасць, мысленне, рытуальна-абрадавыя і культурна-бытавыя паводзіны і г. д.). Праблемы «захавання-адраджэння» нацыянальных традыцый. Падтрымка сацыяльна-педагагічных ініцыятыў насельніцтва. Неабходнасць этнізацыі ўсіх сфер грамадскага жыцця.

Арганізацыя выхавання на аснове свят народнага календара. Магчымасці сямейнага і грамадскага выхавання пры засваенні нацыянальна-культурных каштоўнасцей. Правядзенне народных свят у школе. Асаблівасці арганізацыйна-выхаваўчай дзейнасці ў сацыяльным асяроддзі. Шлях далучэння дзяцей да духоўнай спадчыны продкаў пры каардынацыі намаганняў выхаваўчых інстытутаў грамадства.

Арыентацыя на адмаўленне ад спажывецкага падыходу да фальклорных традыцый народа. Фальклорная спадчына як адна з важнейшых састаўляючых частак духоўнага свету школьнікаў і асноўны сродак фарміравання іх нацыянальнай свядомасці. Аднаўленне народных традыцый. Зварот да народных звычаяў і абрадаў. Выкарыстанне асаблівасцей беларускага народнага характару пры арганізацыі выхавання. Сацыялізацыя школьнікаў сродкамі традыцыйнай культуры і мастацтва. Увядзенне этнакультурных элементаў у змест адукацыі.

### Літаратура

**Арлова Г. П.** Народная педагогіка ў выхаваўчай рабоце школы. Мн., 1995.



**Барташэвіч Г. А.** Фальклор у сістэме выхавання // Праблемы выхавання. Мн., 1995. Вып. 1.

**Беларускія народныя гульні.** Метадычны дапаможнік / Склад. М. У. Грудзінскі. Дулебы, 1992.

**Болбас В. С.** Этнапедагагічныя ідэі продкаў — у сучаснае выхаванне // Народная асвета. 1995. № 11.

**Валадзько У. Ф.** Выхаванне школьнікаў. Мн., 1993.

**Грымаць А. А., Варанецкая Л. М.** Беларуская народная педагогіка ў школе. Мн., 1996.

**Ідэі народнай педагогікі** і шляхі ўкаранення іх у практыку школ Беларусі // Настаўніцкая газета. 1991. 14 снежня.

**Калачова І. І.** Роля сям'і ў трансмісіі этнапедагагічных традыцый беларусаў // Адукацыя і выхаванне. 1995. № 4.

**Сучкоў І. І.** Кніга. Школа. Фальклор. Этнапедагагічная мадэль школы // Адукацыя і выхаванне. 1996. № 11.

**Сучкоў І. І.** Сцежка да нацыянальнай школы // Пачатковая школа. 1995. № 10.

**Сучкоў І. І.** Этнашкола // Пачатковая школа. 1996. № 9.

**Шчасны Р. С.** Адраджэнне народнай педагогікі // Народная асвета. 1992. № 5.